**Мацяюн, А**. «Мой родны кут, як ты мне мілы…» / А. Мацяюн //Віцебскі рабочы. — 1989. — 7 верас. — С. 3.

# «МОЙ РОДНЫ КУТ, ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ…»



*Пісьмы з фронта… Бацькавых пісьмаў дадому з Вялікай Айчыннай не захавалася.*

*Аб чым пісаў бацька ў хвіліны зацішша перал боем? Відаць аб журбе па дарагіх людзях, па родных мясцінах, па доме. І я ўпэўненны, што чырвонай стужкай праз яго пісьмы праходзіла вера ў нашу справядлівую справу, надзея, што калі-небудзь прагучыць апошні выстрел і па зямлі ўсталюецца вечны мір.*

*Ды вось у маіх руках пісьмы, датаваныя жніўнем – кастрычнікам 1987 года. Пісьмы малодшага брата, які не вярнуўся з вайны ў Афганістане.*

*Прапаршчык Мацюян Раман Іосіфавіч подзвігу не здзейсніў. Яго біяграфія подобная на біяграфію многіх равеснікаў. Нарадзіўся Раман 22 лістапада 1958 года ў вёсцы Гулідава Глыбоцкага раёна, там жа скончыў васьмігадавую школу. У 1973 годзе паступіў у Віцебскі тэхнікум фізічнай культуры. Вучыўся добра, меў спартыўныя разрады па футболу, веласпорту, класічнай барацьбе. У лістападзе 1977 года быў прызваны ў рады Савецкая Арміі, службу праходзіў у Будапеште. Пасля звальнення ў запас тры гады ўзначальваў ДСТ «Ураджай» у Вілейцы. Аднак жыла ў Рамане любоў да арміі, і ў 1982 годзе ён ідзе служыць у адну з авіацыйных часцей Беларускай ваеннай акругі. У жніўні 1987 года прапаршчык Р.Мацяюн быў накіраваны ў Рэспубліку Афганістан. Вось, бадай, і ўсе вехі біяграфіі майго малодшага брата.*

*Пазней я даведаўся, што ў Афганістан ён паехаў замест аднаго свайго саслужыўца, які сарваў з сабе пагоны, але так і не пакінуў абжытыя цёплыя мясціны. А калі мне давялося сустрэцца на афганская зямлі з баявымі таварышамі свайго брата, то яны мне сказалі: родныя і блізкія могуць ім ганарыцца, з Раманам кожны з нас пайшоў бы ў разведку… Заўважу, што для нас, "афганцаў" гэта найвышэйшы крытэрый ацэнкі чалавека.*

*Вось такім быў мой малодшы брат, які ў няпоўныя трыццаць год ступіў у бессмяротнасць.*

*І ўсё-такі няхай пра яго раскажуць яго ж пісьмы. За два месяцы і 21 дзень толькі бацькам ён адправіў 18 пісьмаў.*

Прывітанне з Кабула!

…Вы на ўсе мае пісьмы адказы не пішыце, а я вам буду пісаць часта…

Ну, як вашы справы? Хутка пачнеце ўжо капаць бульбу. І як яна вырасла? Ці змалацілі ячмень? Ці ёсць сёлета хоць троху яблыкаў? Тут нам часам даюць яблыкі, памідоры, вінаград Ну, а маладую бульбу, хатнюю, пакаштую ў наступным годзе. Вось ужо будзе месяц, як я паехаў, час гэты прайшоў хутка… Больш за ўсё мне хочацца нашай вады з калодежа. 29.08.87 г.

Добры дзень, мае дарагія, мамачка і ўсе, хто зараз ёсць дома. З вялізным прывітаннем да вас я. Сёння ў мяне радасць, я атрымаў ваша пісьмо…

Дарагія мае і любімыя бацькі. Яшчэ раз вам пішу і прашу за мяне не хвалявацца.

…Мамачка, родная мая, я вельмі цябе прашу – не хвалюйся, галоўнае – беражы здароўе. Я буду часцей вам пісаць, каб вы за мяне не хваляваліся, добра?

Заўтра будзе роўна месяц, як я паехаў з дому. За гэты месяц я ўжо змог вызначыцца. Прыязджала камісія, правярала парадак і навогул службу. Мяне адзначылі. Праўда, за пакой, дзе я жыву, паўшчувалі, проста не паспеў яшчэ зрабіць поўны парадак. Але сёння паўдня працаваў, і ўсё ўстала на свае месцы. Цяпер у меня і пакоі амаль як дома…

Дарагія мае, галоўнае вы не хвалюйцеся, куды ж я і ўсе мы без вас, беражыце свае здароўе, мае адзіныя. Я так не хачу,к аб вы за мяне непакоіліся. 30.08.87 г.

Я вам пісаў ці не, што мне тут давялося папарыцца венчыкам з эўкаліпта, быццам бы нічога, але да нашых бярозавых яму далёка. Так, калі ад’язджаеш у чужыя краі і пачынаеш усё параўноўваць са сваёй радзімай, усё становіцца дома мілейшым, раднейшым і лепшым. Памятаеце, як Юра пісаў з арміі: «Мой родны кут, як ты мне мілы…» Баця, ты нават і цяпер гэта часта гаворышь, а гэта ж сапраўды так. Усё-такі чалавек дзіўна створаны. Калі дома, побач з роднымі і блізкімі, – усё здаецца будзёным, простым. А троху далей ад’едзеш, усё здаецца іншым. Не ведаю, можа пасля майго прыезду дадому я ўсё буду ацэньваць інакш. Ну хопіць, а то ў філасофію ўдарыўся.

У нас тут бібліятэка, дык я цяпер у вольны час чытаю кнігі.

Дарагія мамачка і баця, я вас дужа прашу не хвалявацца за мяне… А галоўнае – беражыце сябе і не расстройвацеся за вашага сын, усё ў яго нармальна, мамачка, гэта табе асабліва пішу.

Моцна вас цалую, дарагія. Усміхніцеся адзін аднаму, а цяпер, мама, пацалуй бацю. Ну вось і ўсё нармальна, гэта вы за мяне пацалавалі сабе. Раман. 3.09.87 г.

П. С. Учора ў Юркі-меншага быў дзень нараджэння. Я яго не павіншаваў, не змог. Вось напішу пісьмо і яму, а там і павіншую.

Прывітанне з Кабула!

Добры дзень, маі родныя!

Сёння атрымай ад вас пісьмо. Во ўжо не думаю, што ў дваццаць дзевяць гадоў буду чакаць пісьмы з такім нецярпеннем, а вы таксама, відаць, не думалі, што прыйдзецца пісаць пісьмы на палявую пошту, гэтак жа, як і тады, калі я служыў тэрміновую. Але служба ёсць служба. Тут служыць можна, ды і трэба. Служу нармальна, спагнанняў стараюся не атрымліваць. Работы многа, а гэта добра. Калі больш працуеш, няма часу сумаваць…

А як вы там спраўляецеся? Так, дужа дрэнна, што бульба сёлета не ўрадзілася. Але, у прынцыпе, як яна магла вырайсці, калі ішлі дажджы, а сонейка было рэдкім госцем. Я вось думаю, што калі б афганскае сонца ды нашым дажджам – вось бы ўраджаі былі.

Цямнее ў нас рана. Прыгожа глядзець, калі сонейка з-за гор выходзіць. Горы над сонцам ужо, а у нас, на зямлі, яшчэ цемнавата, і раптам заззяе сонца. 12.09.87 г.

Здароўе маё добрае, амаль як у касманаўтаў, так што ў гэтых адносінах вы за мяне не хвалюйцеся.

Як ваша здароўе? Я вас вельмі прашу, беражыце сябе, як можаце. Хаця прасіць – адно, а дапамагчы – другое, але цяпер гэта не ў маіх сілах. Дай калі ў Мінску быў, вы не надта яе бачылі ад мяне, хаця па магчымасці рабіў, что мог. Вы ўжо прабачце мне за гэта. Канечне, і мой ад’езд сюды таксама не адбіваецца на вашым здароўі дабром, відаць, гэта мой чарговы неабдуманы ўчынак у адносінах да вас. Але я ўсё ж прашу вас, мае дарагія бацькі, не сярдуйце на мяне. З аднаго боку, усё ж мне трэба было паехаць сюды, тут – абавязак… Прашу вас, не сярдуйце на мяне за гэта. Бо ты ж, бацяь, сам казаў, што твае чатыры сыны пастаяннв стаяць пад ружжом. На тое мы і салдаты, каб быць там, дзе цяжэй… А наконт дрэннага зыходу, ты ўспомні, бацяь, прыказку або расказ, што ты расказваў, я маю на ўвазе, калі спыталі ў марака – ці не баіцца ён плаваць на караблі. (Наш бацька заўсёды, гаворачы аб рызыцы ў жыцці, у службе і г. д., любіць расказваць наступную гісторыю. Аднойчы сустрэліся два сябры, марак і інжэнер. Апошні пытае: «Скажы, ці ж табе не страшна хадзіць у мора?» – «Не», – адказвае марак. – «Тады скажы, - працягвае інжэнер, – як памёр твой дзед?» – «Ён патануў пры караблекрушэнні». – «А як памёр бацька?» – «Ён таксама патануў у моры», – спакойна адказаў марак. – «І ты не баішься плаваць?» – абураўся інжэнер. – «Чаго баяцца. Ты лепш скажы, як памёрлі твае продкі?» – працягваў марак. – «Як, як? Звычайна, лежачы ў ложку!» – «Але ж ты не баішся кожны дзень класціся ў ложак?» – закончыў гэту размову марак. – А. М.). А мы ўсё ж кладземся спаць у ложак. Так што вы мяне зразумелі, спадзяюся… 17.09.87 г.

Добры дзень, мае дарагія мама, тата і ўсе, хто цяпер ёсць дома!

Учора атрымаў адразу два вашых пісьмы. Дзякуй вам вялізнае за іх. Справы мае ідуць нармальны, змяненняў у службе няма ніякіх. Служу, як мае быць, раблю ўсё, што ад мяне патрабуецца, так і служыць лягчэй, ды і спагнаннямі мне не хочацца абрасці, бо наперадзі так многа службы. 23.09.87 г.

Зноў рашыў напісаць вам. Справы ідуць па-ранейшаму добра. Вось ўжо і верасень заканчваецца. Гэтыя два месяцы, што я тут, для мяне праляцелі хутка. Так і не заўважым, як навагоднюю ёлачку прыйдзецца ставіць. Канечне, тут яе днём з агнём не знойдзеш, але вы як заўсёды будзеце яе ставіць.

…Цяпер у вас залатая пара, лісце на дрэвах жоўтае, я тут яшчэ ўсё цяплынь стаіць…

Як ваша здароўе? Беражыце сябе по магчымасці. Бо ў вас наступаюць халады, старайцеся не прастужвацца. Галоўнае, каб вы сябе добра адчувалі, для нас, вашых дзяцей, гэта самае галоўнае. Бо калі вы здаровыя і вясёлыя, то і нам намнога лягчэй, дзе б мы не знаходзіліся – ці то ў Мінску, ці то ў далёкім Афганістане, і мы заўсёды разам з вамі, мае дарагія бацькі! 27.09.87 г.

…Мамачка і баця, вы не перажывайце за мяне, калі ласка, я тут адчуваю сябе нядрэнна, гэта ўжо точна. Бо я ж раней стараўся вам не хлусіць. А тым больш цяпер, калі я так далёка ад дому, мне зусім гэта не трэба.

Прачытаўшы ваша пісьмо, я крыху ўзрадаваўся, а ўзрадаваўся таму, што вы правільна зразумелі, дзеля чаго тут знаходжуся я і да мяне падобныя.. Бо праўда ж, калі разабрацца, то тымі хлопцамі, хто нясе тут нялёгкую салдацкую службу, трэба ганарыцца, а работа тут бывае розная.

І правільна ты, баця, напісаў, што ў Юры-маладшага (ён следчы, закончыў Мінскую вышэйшую школы міліцыі. – А. М.) небяспекі не менш, чым у мяне. Бо вораг яго скрытны, а тут крыху прасцей. Ты сам быў на вайне і ўсё гэта можашь супаставіць. Я вельмі рады таму, што вы ўсё ж верыце ў сваіх сыноў, а я думаю, что яны не павінны падвесці вас у любых сітуацыях, ва ўсякім выпадку мы стараемся выконваць свой абавязак з гонарам. А калі ўжо ў нас на плячах пагоны, хаця ва ўсіх розныя, то і трэба нам быць там, дзе гэтага патрабуе Радзіма наша. Па-мойму, у гэтым пытанні мая праўда. Ты, мама, пішашь, што рэдка да вас прыяджаюць і тыя, хто бліжэй, што ад вас няма чаго ўзяць і г. д. Тут твая праўда толькі ў адным: так, у нас у кожнага свае семі, свае інтарэсы. І не заўсёды мы робім тое, што хочацца, нават у такім пытанні, як прыехаць дамоў.

А ў астатнім, мама, ўсё ж праўда не твая. Наша любоў да вас не згасне, хаця мы самі ўжо сталі бацькамі і маці. Мы памятаем усю вашу дабрыню і ласку, памятаем і ведаем, колькі сіл і здароўя вы аддалі дзеля таго, каб паставіць усіх нас на моцныя ногі, памятаем і ніколі не забудзем.

…Канешне, і ў мяне з Мінска не заўсёды атрымліваецца прыехаць да вас, калі гэта трэба было і вам, і мне. У мяне была служба, а служба ёсць служба, самі разумееце. Але я вам шчыра скажу – усе мы, вашi дзецi, заўсёды імкнуліся і імкнёмся да свайго дому, да вас, нашы родныя. Бо ўсё добрае ў нас звязана з Гулідавам, з нашай хатай. Бо адсюль 13 гадоў назад вы з бацем везлі мяне на конях у Канстанцінава на вакзал, калі я адязджаў у Віцебск у тэхнікум. А я нават тады і не думаў, што буду вяртацца ўжо толькі госцем, гэтак жа і ўсе астатнія вашы дзеці. А ўжо вам пасля кожнага такога ад'езду заставалася толькі адно – гэта чакаць нас, чакаць нашых пісьмаў. І тут мы, як аказалася, былі не на вышыні. Я і сам, калі быў у Мінску, пісаў вам рэдка, дый ці ж такія пісьмы. Гэта ўсё таму, што калі ў самаго ўсё добра, як кажа баця, «сыты, п’яны і пад носам табакерка», то здаецца – і ўсім жывецца добра. А цяпер я паспытаў зусім іншае жыццё, жыццё без сямі і без дому, і ўразумеў: вельмі многае трэба ўспрымаць інакш і думаць не толькі аб сваім дабрабыце, аб сваім душэўным стане. Думаю, што мае знаходжанне ў Афганістане мяне многаму навучыць і на жыццё прыйдзецца глядзець крыху інакш. Вось толькт дрэнна, што да нас гэта прыходзіць тады, калі нам трыццаць гадоў, а павінна прыходзіць намнога раней. Іменна таму жыццё называюбць складанай штукай, а яно, на жаль, толькі адно і выправіць уласных памылак не атрымліваецца, што зрабіў, перарабіць ужо немагчыма, вы гэта самі разумееце, бо ў вас за плячыма вялікі жыццёвы вопыт. Можа, і я ўсё гэта зразумеў бы намнога пазней, калі б не папаў сюды, можа і не было б «разумных» і частых пісьмаў да вас. А жыў бы толькі дзеля сябе, еў, як кажуць, сваю моркву, і не цягнула б мяне на гэтую філасофію. Такім чынам, я думаю, не трэба вам згушчаць фарбы, не трэба сябе настройваць на адзіноту і рабіць паспешлівыя вывады. Я ў прынцыпы яшчэ малады. І магу у сваіх вось гэтых роздумах і памыляцца, а калі я памыляюся, вы не саромейцеся, папраўляйце мяне. А вось калі я прыеду ў вотпуск, то пасля лазні і пагаманім, як у старыя, добрыя часы.

…Беражыце сябе, цёпла апрынайцеся, каб не застудзіцца. Перадавайце ўсім ад мяне прывітанне. Моцна, моцна цалую. Ваш Раман. 8.10.87 г.

Рашыў напісаць вам невялікае пісьмо. Пішу з гэтага месца апошняе пісьмо. Справа ў тым, што мяне пераводзяць у іншую часць… Там, у Лашкаргаху, буду на сваім месцы, служыць па сваёй спецыяльнасці – сувязістам. Хлопцы кажуць, што горш не будзе, дык вы за мяне не турбуйцеся…

У суботу быў у Паўліка (гэта пляменнік, у гэты час служыў тэрміновую ў Кабуле. – А. М.), у яго ўсё добра. Думаў яшчэ сёння заехаць, але не атрымалася, сказалі ехаць. Канешне, дрэнна, што так атрымалася. Але мы – салдаты, а салдат павінен быць, дзе загадаюць. Я гэта так разумею.

…Ну, а як вам там жывецца? Беражыце сябе, я вас вельмі прашу.

Да пабачэння. Моцна, моцна цалую. Ваш Раман. 20 кастрычніка 1987 г.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ГІБЕЛІ

Паважаная Марыя Ігнатаўна і Іосіф Іосіфавіч!

Камандаванне, партыйная і камсамольская арганізацыі вайсковай часці з глыбокім засмучэннем паведамляюць Вам, што, выконваючы баявое заданне, верны ваенная прысязе, Ваш сын – Мацяюн Раман Іосіфавіч загінуў 21 кастрычніка 1987 года.

Ён загінуў са зброяй у руках, да канца выканаўшы абавязак воіна-інтэрнацыяналіста. Заўчасная смерць вырвала з нашых радоў Рамана Іосіфавіча, але нішто не выкрасліць яго з нашай памяці. Мы клянёмся Вам, што будзем бязлітасна знішчаць ворага і помсціць за нашага таварыша.

Паважаная Марыя Ігнатаўна і Іосіф Іосіфавіч, прыміце нашы шчырыя спачуванні з прычыны напаткаўшага Вас цяжкага гора.

Памяць пра Вашага сына і нашага таварыша Мацяюна Рамана Іосіфавіча назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Камандзір вайсковай часці.

Намеснік камандзіра в. ч.

***Публікацыю падрыхтаваў гвардзыі маёр А. Мацяюн***